# КАЛЯНДАР ЮБІЛЕЙНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ НА 2024 ГОД

**Мядзел**, горад, цэнтр раёна Мінскай вобласці (1324) — **700 г. з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах**

**Узда**, горад, цэнтр раёна Мінскай вобласці (1494) — **530 г. з часу заснавання**

**Старыя Дарогі**, горад, цэнтр раёна Мінскай вобласці (1524) — **500 г. з часу першага ўпамінання ў гістарычных крыніцах**

**Радзівіл Мікалай Крыштоф-Сіротка** (1549—1616), дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага — **475 г.**

**Вілейка**, горад, цэнтр раёна Мінскай вобласці (1599) — **455 г. з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах**

**Нясвіжская капэла Радзівілаў** (1724—1809), прыдворны аркестр князёў Радзівілаў — **300 г. з пачатку дзейнасці**

**Стоўбцы**, горад, цэнтр раёна Мінскай вобласці (1729) — **295 г. з часу атрымання граматы на магдэбурскае права**

**Рымінскі Міхал** (1769, г. Чэрвень — 1797), танцоўшчык, спявак і драматычны акцёр — **255 г.**

**Каладзееў Іван Хрысанфавіч** (1859—1914), бібліяфіл, уладальнік буйнейшай у Еўропе бібліятэкі па гісторыі вайны 1812 г. — **165 г.**

**Леанід (Біруковіч Леанід Платонавіч)** (1864, Крупскі раён — 1937), протаіерэй, новапакутнік Мінскай епархіі Беларускай Праваслаў Царквы — **160 г.**

**"Пухавіцкая кардонная фабрыка"** (1899), адкрытае акцыянернае таварыства, адно са старэйшых цэлюлозна-папяровых прадпрыемстваў Беларусі — **125 г.**

**"Слуцкі край"**, раённая газета (г. Слуцк, 1919) — **105 г.**

**"Металіст"**, адкрытае акцыянернае таварыства (1929), буйнейшы ў Беларусі вытворца стальнога эмаліраванага посуду і іншых прадметаў народнага ўжытку — **95 г.**

**“Узвышша”**, раённая газета (да сакавіка 2011 г. — “Сцяг Кастрычніка”) (г. Дзяржынск, 1929) — **95 г.**

**“Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці”**, дзяржаўная ўстанова (1939) — **85 г.**

**“Бархім”**, адкрытае акцыянернае таварыства, буйнейшы вытворца пральных парашкоў і іншых тавараў бытавой хіміі ў Рэспубліцы Беларусь (г. Барысаў, 1944) — **80 г. з часу аднаўлення**

**“Беразінскае”**, адкрытае акцыянернае таварыства (Маладзечанскі раён, 1949) — **75 г.**

**“Клецкі мехзавод”**, адкрытае акцыянернае таварыства ў складзе холдынга “БелаўтаМАЗ” (1969) — **55 г.**

**“Купалінка”**, адкрытае акцыянернае таварыства ў складзе “Беллегпрам” (г. Салігорск, 1969) — **55 г.**

**Амяльнянскі**, біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння (Пухавіцкі раён, 1979) — **45 г.**

**Дзянісавіцкі**, біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння (Капыльскі раён, 1979) — **45 г.**

**Копыш**, біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння (Пухавіцкі раён, 1979) — **45 г.**

**Мацеевіцкі**, біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння (Пухавіцкі раён, 1979) — **45 г.**

**Фаліцкі мох**, біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння (Старадарожскі раён, 1979) — **45 г.**

**Чэрнеўскі**, біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння (Барысаўскі раён, 1979) — **45 г.**

**“Капыльскі раённы краязнаўчы музей”**, дзяржаўная ўстанова (1979) — **45 г. з часу адкрыцця**

**Падсады**, біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння (Мінскі раён, 1999) — **25 г.**

**“Старадарожскі раённы гісторыка-этнаграфічны музей”**, дзяржаўная ўстанова (1999) — **25 г.**

Студзень

**1 — Андруховіч Сцяпан Адамавіч** (1909, Уздзенскі раён — 1989), жывапісец — **115 г.**

**1 — Вішнеўскі Міхаіл Іванавіч** (1949, в. Сёмкаў Гарадок, Мінскі раён), вучоны-філосаф, заслужаны работнік адукацыі Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны — **75 г.**

**1 — “Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей”**, дзяржаўная ўстанова (аг. Блонь, Пухавіцкі раён, 1974 г.) — **50 г. з часу адкрыцця (заснаваны ў 1968)**

**2 — Маўрычаў Анатоль Сяргеевіч** (1949, в. Куранец, Вілейскі раён), вучоны ў галіне анкалогіі, выдатнік аховы здароўя Беларусі — **75 г.**

**2 — “Маладзечанскі завод парашковай металургіі”**, вытворчае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства (1984 г.) — **40 г. з часу стварэння**

**2 — Марозаў Змітрок (Дзмітрый Дзмітрыевіч)** (1954, п. Язбы, Крупскі раён), пісьменнік, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, рэспубліканскай літаратурнай прэміі “Залаты Купідон” — **70 г.**

**4 — Сарока Дзмітрый Уладзіміравіч** (1929, в. Крапіўнікі, Валожынскі раён), мастак, які працуе ў розных жанрах станковага жывапісу — **80 г.**

**4 — Шабовіч Мікола (Мікалай Віктаравіч)** (1959, в. Бадзені, Мядзельскі раён), паэт, на вершы якога напісана больш за 170 песень, педагог, вучоны-філолаг — **65 г.**

**5 — Крывашэеў Сяргей Паўлавіч** (1944, г. п. Старобін, Салігорскі раён), архітэктар, заслужаны архітэктар Беларусі — **80 г.**

**6 — Карлюкевіч Алесь (Аляксандр Мікалаевіч)** (1964, в. Зацітава Слабада, Пухавіцкі раён), дзяржаўны дзеяч, публіцыст, краязнаўца, літаратуразнаўца, лаўрэат шматлікіх прэмій — **60 г.**

**7 — Клебановіч Васіль Фёдаравіч** (1929, в. Грэск, Слуцкі раён — 2008), вучоны-глебазнавец, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1976) — **95 г.**

**7 — Царфін Файбіш-Шрага** (1899, г. п. Смілавічы, Чэрвеньскі раён — 1975), мастак, ілюстратар, дызайнер, паэт, прадстаўнік "Парыжскай школы" мастакоў — **125 г.**

**9 — Стасевіч Іван Нічыпаравіч** (1929, в. Мядзведня, Старадарожскі раён — 1998), жывапісец, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — **95 г.**

**10 — Кардаш Іван Браніслававіч** (1919, в. Захарычы, Мінскі раён — 1993), вучоны ў галіне гігіены і санітарыі, заслужаны ўрач Беларусі, кавалер ордэна "Знак Пашаны", удзельнік партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну — **105 г.**

**10 — Яраш Міхась (Міхаіл Рыгоравіч)** (1929, Клецкі раён — 1987), літаратуразнаўца, крытык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа — **95 г.**

**13 — Корж Васіль Захаравіч** (1899, Салігорскі раён — 1967), ваенны дзеяч, генерал-маёр, удзельнік вайны ў Іспаніі 1936—1939 гг., адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны, кавалер ордэна Леніна (двойчы), Чырвонага Сцяга (двойчы), Айчыннай вайны I ступені і Чырвонай Зоркі, Герой Савецкага Саюза — **125 г.**

**14 — Шаранговіч Васіль Пятровіч** (1939, в. Качаны, Мядзельскі раён — 2021), мастак, педагог, народны мастак Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Польшчы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **85 г.**

**17 — Якімовіч Алесь (Аляксандр Іванавіч)** (1904, в. Чурылава, Уздзенскі раён — 1979), пісьменнік, адзін з заснавальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **120 г.**

**18 — Казлоў Вілорый Аляксеевіч** (1934, г. Мінск ці г. п. Плешчаніцы, Лагойскі раён — 2003), мастак тэлебачання, заслужаны работнік культуры Беларусі — **90 г.**

**19 — Валынец Андрэй Іванавіч** (1904, в. Жаўткі, Віл. пав. Вілен. губ. (цяпер Вілейскі раён) — 1965), удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Вілейскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза — **120 г.**

**19 — Мархель Таццяна Рыгораўна** (1939, в. Шпакоўшчына, Смалявіцкі раён), актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Беларусі — **85 г.**

**20 — Матусевіч Іван Іванавіч** (1884, в. Лапаровічы, Мінскі раён — 1943), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага патрыятычнага падполля ў Вялікую Айчынную вайну — **140 г.**

**20 — Сянкевіч Аляксандр Антонавіч** (1884, в. Мікалаеўшчына, Мін. пав., Мін. губ. (цяпер Стаўбцоўскі раён) —1938), дзяржаўны і палітычны дзеяч Беларусі, вучоны, пісьменнік, публіцыст — **140 г.**

**21 — Агракамбінат "Дзяржынскі"**, адкрытае акцыянернае таварыства, лаўрэат Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці (Дзяржынскі раён, 1979) — **45 гадоў з пачатку дзейнасці**

**21 — Бачыла Фёдар Апанасавіч** (1924, в. Бардзілаўка, Мінскі раён — 1992), удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, журналіст, заслужаны работнік культуры Беларусі — **100 г.**

**21 — Стаховіч Алег Аляксандравіч** (1934, былая в. Горкі-Абчак, Мінскі раён), архітэктар, сярод работ якога (у аўтарскім калектыве) Курган Славы, галоўны ўваход у мемарыяльны комплекс "Брэсцкая крэпасць-герой", лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **90 г.**

**21 — Юркевіч Сяргей Фёдаравіч** (1954, в. Ілава, Мядзельскі раён — 2002), рэжысёр, тэатразнаўца, заснавальнік Гродзенскага абласнога тэатра лялек і Мінскага абласнога тэатра "Батлейка", даследчык мастацтва лялечнага тэатра — **70 г.**

**25 — Гурыновіч Адам Гіляры Калікставіч** (1869, былы фальв. Кавалі (Кавалькі), Віл. пав., Вілен. губ. (цяпер

Мядзельскі раён) — 1894), паэт-дэмакрат, фальклярыст, рэвалюцыянер — **155 г.**

**26 — Жбанаў Уладзімір Іванавіч** (1954, в. Станькава, Дзяржынскі раён — 2012), скульптар, майстар гарадской скульптуры, аўтар шэрага вядомых кампазіцый у гарадах Беларусі — 70 г.

**29 — Рубін Іван Ільіч** (1954, былы хутар Раздоры, Стаўбцоўскі раён — 1993), паэт, аўтар зборнікаў вершаў і паэм — **70 г.**

**31 — Будавей Міхаіл Сямёнавіч** (1949, Клецкі раён), графік, жывапісец — **75 г.**

Люты

**1 — Карчміт Міхаіл Аляксандравіч** (1949, в. Радзеўцы, Маладзечанскі раён — 2004), гаспадарчы дзеяч, заслужны работнік сельскай гападаркі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1999), Герой Беларусі (2001) — **75 г.**

**2 — Варона-Варанецкі Мікалай Аляксеевіч** (1909, Капыльскі раён — ?), беларускі паэт, сасланы ў Якуцію — **115 г.**

**2 — Нісневіч Сіма Герасімаўна** (1914, г. Чэрвень — 1985), музыказнавец, педагог, даследчык гісторыі беларускай прафесійнай музыкі, яе сувязяў з фальклорам — **110 г.**

**3 — Ліўшчыц Іосіф Майсеевіч** (1904, г. Дзяржынск — 1997), вучоны ў галіне гідралогіі, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі — **120 г.**

**10 — Калядка Мікалай Сяргеевіч** (1944, в. Новая Дуброва, Любанскі раён), канструктар сродкаў аўтаматызацыі ў мікраэлектроніцы, арганізатар іх вытворчасці, вынаходнік СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2000) — **80 г.**

**11 — Пятровіч Эдуард Аляксандравіч** (1939, г. Жодзіна), вучоны ў галіне аграхіміі, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі, кавалер ордэна “Знак

Пашаны” (1973, 1978), выдатнік адукацыі Беларусі — **85 г.**

**15** — **Гарэлік Пётр Васільевіч** (1949, Маладзечанскі раён), вучоны-хірург, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **75 г.**

**20** — **Руцкі Аляксандр Іванавіч** (1904, г. Стоўбцы — 1985), вучоны ў галіне электратэхнікі, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі — **120 г.**

**24** — **Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту “Раўбічы”**, установа (в. Раўбічы, Мінскі раён, 1974) — **50 г. з пачатку дзейнасці**

**24** — **Старычонак Васіль Дзянісавіч** (1954, в. Луцішча, Крупскі раён), мовазнаўца, літаратуразнаўца, педагог, аўтар вучэбна-метадычных дапаможнікаў, даведнікаў і слоўнікаў па беларускай і рускай мовах, моўнай культуры, метадычных рэкамендацый па напісанні сачыненняў, выдатнік адукацыі Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны — **70 г.**

**26** — **Колас Георгій Данілавіч** (1929, в. Куцень, Чэрвеньскі раён — 1994), літаратурны і тэатральны крытык, публіцыст, кінадраматург — **95 г.**

**27** — **Радзівіл Кароль Станіслаў (мянушка Пане Каханку)** (1734, г. Нясвіж — 1790), дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, генерал-лейтэнант — **290 г.**

**28** — **Сухаў Юрый Леанідавіч** (1954, в. Мачулішчы, Мінскі раён), мастак, які працуе ў галіне прыкладной графікі, афармленчым мастацтве — **70 г.**

**28** — **Канапацкі Ібрагім Барысавіч** (1949, г. п. Смілавічы, Чэрвеньскі раён — 2005), вучоны-гісторык, даследчык міжнацыянальных адносін, гісторыі і культуры беларускіх татар, грамадскі і рэлігійны дзеяч — **75 г.**

## Сакавік

**1** — **Канапля Яўген Фёдаравіч** (1939, в. Межная Слабада, Клецкі раён — 2010), вучоны ў галіне біяхіміі і радыёбіялогіі, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **85 г.**

**1 – “Маладзечнамэбля”,** адкрытае акцыянернае таварыства, адно з вядучых прадпрыемстваў мэблевай прамысловасці Беларусі (1954) – **70 г. з часу заснавання**

**2 – Тумар Віктар Андрэевіч** (1919, Смалявіцкі раён – 1944), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза – **105 г.**

**4 – Дзялендзік Анатоль Андрэевіч** (1934, в. Кулакі, Салігорскі раён – 2019), драматург, празаік, сцэнарыст, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – **90 г.**

**4 – Яновіч Леанід Аляксандравіч** (1934, в. Кажушкі, Слуцкі раён), вучоны-матэматык, член-карэспандэнт НАН Беларусі, кавалер ордэна “Знак Пашаны” – **90 г.**

**9 – Карсалін Кандрат Ільіч** (1809, г. Слуцк – 1883 ці 1884), мастак, акадэмік расійскай Акадэміі мастацтваў – **215 г.**

**10 – Гарбацэвіч Праскоўя Данілаўна** (1919, Слуцкі раён – 1999), урач-фтызіятр, заслужаны ўрач Беларусі – **105 г.**

**10 – Наркевіч Аркадзь Іосіфавіч** (1929, в. Воронаўшчына, Капыльскі раён – 2002), мовазнавец, педагог, даследчык культуры мовы, яе стылістыкі і граматыкі, выдатнік адукацыі Беларусі – **95 г.**

**13 – Зінкевіч Марыя Міронаўна** (1924, Мінскі раён – 2010), актрыса, заслужаная артыстка Беларусі – **100 г.**

**14 – Карачун Уладзімір Рыгоравіч** (1914, в. Кухцічы, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер Уздзенскі раён) – 1998), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза – **110 г.**

**14 – Клебановіч Міхась (Міхаіл Іванавіч)** (1934, аг. Грэск, Слуцкі раён), пісьменнік, сцэнарыст, заслужаны работнік культуры Беларусі – **90 г.**

**15 – Прыстром Мар’ян Станіслававіч** (1944, в. Янкоўцы, Дзяржынскі раён), вучоны ў галіне кардыялогіі і геранталогіі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, выдатнік аховы здароўя Беларусі – **80 г.**

**17 – Дробыш Станіслаў Іосіфавіч** (1939, былая в. Заграддзе, Слуцкі раён – 2013), хормайстар, педагог,

прапагандыст народна-харавога мастацтва, стваральнік і мастацкі кіраўнік (1979—2013) фальклорнага вакальна-харэаграфічнага ансамбля “Валачобнікі” БДУ культуры і мастацтваў, заслужаны работнік культуры Беларусі — **85 г.**

**17** — **Кароткая Ларыса Лявонцьеўна** (1919, в. Астрашыцкі Гарадок, Мінскі раён), літаратуразнаўца, педагог — **105 г.**

**17** — **Шкраба Рыгор Васільевіч** (1919, в. Краснадворцы, Салігорскі раён — 1997), крытык, літаратуразнаўца, заслужаны работнік культуры Беларусі — **105 г.**

**19** — **Самцэвіч Васіль Андрэевіч** (1889, в. Дакудава, Барыс. пав., Мін. губ. (цяпер аг. Дакудава, Крупскі раён) — 1973), педагог, краязнаўца, заслужаны настаўнік Беларусі, аўтар падручнікаў і метадычных дапаможнікаў для пачатковай школы — **135 г.**

**20** — **Іофэ Эмануіл Рыгоравіч** (1939, г. Беразіно), вучоны-гісторык, палітолаг, сацыёлаг, культуролаг, педагог, даследчык Беларускай гістарыяграфіі, гісторыі навукі і культуры, гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі — **85 г.**

**20** — **Родзевіч Чэслаў (Часлаў) Іванавіч** (1889, фальварак Кур’янаўшчына, Віл. пав., Вілен. губ. (цяпер Лагойскі раён) — 1942), тэатральны і грамадскі дзеяч, які ўваходзіў у Першую беларускую трупу Ігната Буйніцкага — **135 г.**

**23** — **Ясавееў Марат Гумеравіч** (1949, г. Маладзечна), вучоны-геолаг і гідрагеолаг, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998) — **75 г.**

**24** — **Сташэўскі (Сташэўскі-Стасевіч) Аляксандр Восіпавіч** (1889, в. Думічы, Капыльскі раён — 1938), дзяржаўны дзеяч БССР, удзельнік Першай сусветнай вайны — **135 г.**

**28** — **Цвірка Кастусь (Канстанцін Аляксеевіч)** (1934, в. Зялёная Дуброва, Старадарожскі раён), паэт, празаік, перакладчык, фалькларыст, этнограф — **90 г.**

**28 — Мохарт Вячаслаў Андрэевіч** (1924, Слуцкі раён — 2003), вучоны ў галіне ўралогіі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **100 г.**

**29 — Гарохавік Валянцін Вікенціевіч** (1949, Лагойскі раён), вучоны-матэматык, член-карэспандэнт НАН Беларусі — **75 г.**

**29 — Бранавіцкі Аляксандр Юльянавіч** (1914, в. Танежыцы, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер аг. Танежыцы, Слуцкі раён) — 1975), вучоны ў галіне патафізіялогіі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **110 г.**

Красавік

**4 — Мазанік Алена Рыгораўна** (1914, в. Паддзягцярня, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер Пухавіцкі раён) — 1996), удзельніца Мінскага патрыятычнага падполля ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, заслужаны работнік культуры Беларусі — **110 г.**

**6 — Хведаровіч Мікола (сапр. Чарнушэвіч Мікалай Фёдаравіч)** (1904, г. Капыль — 1981), паэт, празаік, перакладчык — **120 г.**

**7 — Аўдзей Леанід Вікенцьевіч** (1929, г. Вілейка — 1977), хірург, вучоны, стваральнік навуковай школы гепаталогіі — **95 г.**

**10 — Абрамовіч Аляксандр Міхайлавіч** (1944, в. Забалацце, Нясвіжскі раён), правазнавец, дзяржаўны дзеяч Беларусі, заслужаны юрыст Беларусі — **80 г.**

**16 — Шацько Рыгор Іванавіч** (1959, аг. Ракаў, Валожынскі раён — 2023), акцёр, заслужаны артыст Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2001) — **65 г.**

**16 — Луцэвіч Алег Вікенцьевіч** (1924, в. Дубаўка, Пухавіцкі раён — 2015), мастак у галіне кніжнай, часопіснай і станковай графікі, педагог — **100 г.**

**16 — Слупскі Аляксандр Іванавіч** (1864, г. Слуцк — 1910), беларускі і расійскі літаратар, гісторык, археолаг, аўтар артыкулаў па гісторыі Беларусі — **160 г.**

**18** – **Тышкевіч Яўстафій Піевіч** (1814, мяст. Лагойск, Барыс. пав., Мін. губ. (цяпер г. Лагойск) – 1873), гісторык, археолаг, этнограф, краязнаўца, музеязнаўца, адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі, заснавальнік і старшыня Віленскай археалагічнай камісіі, ганаровы член Пецярбургскай і Стакгольмскай АН, Лонданскага археалагічнага інстытута – **210 г.**

**20** – **Юдэлевіч Міхась (Міхаіл) Львовіч** (1914, г. Смалявічы – 1941), драматург, тэатральны крытык – **110 г.**

**21** – **Налецкі Васіль Пятровіч** (1919, Валожынскі раён – 1997), краязнаўца, гісторык, педагог, выдатнік народнай асветы Беларусі – **105 г.**

**24** – **Яновіч Іван Пятровіч** (1944, в. Вялікія Заўшыцы, Салігорскі раён), канструктар у галіне медыцыны, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996) – **80 г.**

**25** – **Барысенка Васіль Васільевіч** (1904, г. Барысаў) – 1984), літаратуразнаўца, крытык, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа – **120 г.**

**26** – **Гурскі Ілья Данілавіч** (1899, в. Замосце, Уздзенскі раён – 1972), пісьменнік, драматург, заслужаны дзеяч культуры Беларусі – **125 г.**

## Май

**1** – **Корзун Мікола (Мікалай Паўлавіч)** (1934, в. Вялікія Заўшыцы, Салігорскі раён – 1955), пісьменнік, аўтар апавяданняў і аповесцей для дзяцей – **90 г.**

**1** – **Паплаўская Ядвіга Канстанцінаўна** (1949, в. Далідавічы, Валожынскі раён), кампазітар, эстрадная спявачка і выканальніца на клавішных інструментах, народная артыстка Беларусі – **75 г.**

**1** – **Рыжоў Уладзімір Рыгоравіч** (1914, в. Майсееўшчына, Барыс. пав., Мін. губ. (цяпер аг. Майсееўшчына, Барысаўскі раён – 1974), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза – **110 г.**

**1 — Таўранскі (Туган-Таўранскі) Баляслаў** (1904, былая в. Радзівілімонты (цяпер Клецкі раён) — 1974), вучоны-гісторык, архівіст, які займаўся ўпарадкаваннем архіва Радзівілаў — **120 г.**

**2 — Жук Кастусь (Канстанцін Якаўлевіч)** (1954, в. Затур’я, Нясвіжскі раён) , паэт — **70 г.**

**5 — Казакевіч Мікалай Канстанцінавіч** (1934, в. Дулебы, Бярэзінскі раён), жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **90 г.**

**5 — Манюшка Станіслаў** (1819, маёнтак Убель, Ігумен. пав. Мін. губ. (цяпер Чэрвеньскі раён) — 1872), польскі і беларускі кампазітар, дырыжор, педагог, класік польскай і беларускай вакальнай лірыкі, стваральнік нацыянальнай класічнай оперы, першых нацыянальных сімфанічных твораў — **205 г.**

**6 — Трус Паўлюк (Павел Адамавіч)** (1904, в. Нізок, Мін. пав. (цяпер Уздзенскі раён) — 1929), паэт, аўтар лірыка-гераічных і фальклорна-рамантычных паэм, вершаў, гумарыстычных вершаваных павяданняў — **120 г.**

**7 — Грышук Анатоль Уладзіміравіч** (1939, в. Лашаны, Мінскі раён), спарстмен і трэнер (бокс), чэмпіён Беларусі, майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Беларусі, пад кіраўніцтвам якога беларускія спартсмены неаднаразова станавіліся пераможцамі і прызёрамі Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы — **85 г.**

**9 — Цэраскі Вітольд Карлавіч** (1849, г. Слуцк — 1925), расійскі вучоны-астраном, заснавальнік навуковай школы па астрафотаметрыі ў Расіі, педагог, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН — **175 г.**

**9 — Касцюкевіч Вітольд Карлавіч** (1904, Слуцкі раён — 1978), вучоны ў галіне метэаралогіі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **120 г.**

**11 — Алейнік Дзмітрый Іванавіч** (1929, г. Беразіно — 2003), жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — **95 г.**

**11 — Булат Сцяпан Герасімовіч** (1894, в. Слабада, Мін. пав., Мін. губ. (цяпер Уздзенскі раён) — 1921),

дзяржаўны і партыйны дзеяч, журналіст, першы адказны рэдактар газеты “Белорусская деревня” (цяпер “Белорусская нива”) — **130 г.**

**11** — **Радзівіл Геранім Вінцэнты** (1759, Нясвіж — 1786), дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага — **265 г.**

**14** — **Бярновіч Сэрвацы Станіслаў Антон** (1784, в. Бабоўня, Слуцкі пав., Мін. губ. — 1835), дзяржаўны дзеяч — **240 г.**

**15** — **Вайнруб Яўсей Рыгоравіч** (1909, г. Барысаў — 2003), ваенны дзеяч, удзельнік абароны Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1945) — **115 г.**

**20** — **Варапай Яўген Сямёнавіч** (1944, в. Трысцянец, Уздзенскі раён), вучоны-фізік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Бларусі (1994), лаўрэат прэміі БДУ імя А. Н. Сеўчанкі (2003) — **80 г.**

**20** — **Алексютовіч Канстанцін Андрэевіч** (1884, в. Бахаравічы, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер Пухавіцкі раён) — 1943), балетмайстар, педагог, пастаноўшчык сцэнічных варыянтаў народных, класічных і характарных танцаў, кадрыляў, карагодаў, гульняў, аўтар беларускага танца “Бульба” — **140 г.**

**21** — **“Нясвіжскі дзяржаўны каледж імя Якуба Коласа”**, установа адукацыі (1984) — **40 г. з часу адкрыцця**

**23** — **Петухоў Аляксандр Іванавіч** (1919, в. Чырвонае, Лагойскі раён), вучоны-эканаміст, заслужаны эканаміст Беларусі — **105 г.**

**23** — **Логвін Алег Мікалаевіч** (1959, г. Барысаў), спартсмен (веласіпедны спорт), заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіён XXII Алімпійскіх гульняў (1980, Масква), кавалер ордэна “Знак Пашаны” — **65 г.**

**25** — **Русак Адам Герасімавіч** (1904, в. Пясочнае, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер аг. Пясочнае, Капыльскі раён) — 1987), паэт, многія вершы якога пакладзены на музыку і сталі папулярнымі песнямі (“Бывайце здаровы”, “Ой, бярозы да сосны..”, “Не за вочы чорныя” і інш.), заслужаны дзеяч культуры Беларусі — **120 г.**

**27 — Бялевіч Антон Пятровіч** (1914, в. Дуброўка, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер п. Дубоўка, Уздзенскі раён) — 1978), паэт, празаік, перакладчык — **110 г.**

**30 — Глікман Давід Іосіфавіч** (1874, г. Слуцк, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер Слуцкі раён) —1936), паэт-сатырык, драматург — **150 г.**

**30 — Цудзік Мікалай Макаравіч** (1949, в. Бараўляны, Барысаўскі раён — 1999), мастак — **75 г.**

**31 — Пятроўскі Павел Якаўлевіч** (1924, Дзяржынскі раён — 2000), вучоны ў галіне геабатанікі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1972) — **100 г.**

Чэрвень

**2 — Валасовіч Канстанцін Адамавіч** (1869, Клецкі ці Салігорскі раён — 1919), прыродазнаўца, геолаг, географ, хімік, заснавальнік чацвярцічнай геалогіі і палеаграфіі Еўрапейскай Поўначы і Запаляр'я — **155 г.**

**2 — Жукоўскі Усевалад Фёдаравіч** (1924, аг. Пагост, Бярэзінскі раён — 2003), педагог, майстар па вырабу музычных інструментаў, заслужаны работнік культуры Беларусі — **100 г.**

**3 — Лукашэвіч Аляксей Сцяпанавіч** (1924, в. Чарнавосава, Крупскі раён — 1943), удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза — **100 г.**

**10 — Чэрня Хведар (Фёдар Мікалаевіч)** (1939, в. Лінкі, Валожынскі раён — 1983), паэт, аўтар паэтычных зборнікаў і кніг для дзяцей — **85 г.**

**11 -- Хількевіч Анатоль Паўлавіч** (1934, Слуцкі раён — 2005), вучоны-філосаф, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **90 г.**

**13 — Навіцкі Станіслаў Мамертавіч** (1899, былая вёска Шкіндзераўка, Мінскі раён — 1972), цымбаліст, заслужаны артыст Беларусі — **125 г.**

**16 — Ельскі Аляксандр Карлавіч** (1834, в. Дудзічы, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер Пухавіцкі раён) — 1916), гісторык, этнограф, краязнаўца, пісьменнік,

перакладчык, публіцыст, член Акадэміі ведаў у Кракаве — **190 г.**

**16** — **Радзівіл Альбрыхт Уладзіслаў** (1589, г. Нясвіж, Навагр. пав. — 1636), дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, мецэнат — **435 г.**

**19** — **Дальва,** вёска, знішчаная нямецка-фашысцкімі захопнікамі падчас Вялікай Айчынная вайны (Лагойскі раён, 1944) — **75 г. з часу знішчэння**

**20** -- **Іаан (у свеце Варанец Іван Васільевіч)** (20.06.1864, г. п. Халопенічы — 1937) — пратэіерэй, святы Беларускай Праваслаўнай Царквы, новапакутнік Мінскай епархіі — **160 г.**

**20** — **Свістуноў Валерый Піменавіч** (1949, г. Барысаў — 2007), мастак у галіне акварэльнага жывапісу, педагог — **75 г.**

**21** — **Сержпутоўскі Аляксандр Казіміравіч** (1864, в. Бялевічы, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер Слуцкі раён) — 1940), этнограф, фалькларыст, мовазнаўца, даследчык побыту, звычаяў і вераванняў сялян Мазыршчыны і Случчыны, правадзейны член Інбелкульта — **160 г.**

**22** — **Сіняўскі Іван Іванавіч** (1919, в. Жажэлка, Барыс. пав., Мін. губ. (цяпер Смалявіцкі раён) — 2001), празаік, аўтар рамана, аповесцяў, апавяданняў, п’ес, педагог — **105 г.**

**24** — **Літаратурны музей імя Кузьмы Чорнага,** філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры (в. Цімкавічы, Капыльскі раён; адкрыты для наведвальнікаў у 1964 г. як школьны музей) — **60 г. з часу адкрыцця**

**25** — **Бечык Варлен Леанідавіч** (1939, в. Астрашыцкі Гарадок, Мінскі раён — 1985), літаратуразнаўца, крытык, даследчык праблем грамадзянскасці беларускай паэзіі і прозы, творчай індывідуальнасці майстроў слова — **85 г.**

**25** -- **Маладзечанская настаўніцкая семінарыя** (1864, г. Маладзечна — 1920), сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова для падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых народных вучылішч, адна з першых у Расійскай імперыі — **160 г.**

**28** — **Таўкачоў Віталь Антонавіч** (1934, аг. Скірмантава, Дзяржынскі раён), вучоны-фізік, акадэмік НАН Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі і Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **90 г.**

**29** — **“Зыслаў”**, мемарыяльны комплекс у гонар партызанскага руху Мінскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны (Любанскі раён, 1969) — **55 г.**

Ліпень

**2** — **Кахановіч Уладзімір Сямёнавіч** (1929, Слуцкі раён — 1992), вучоны ў галіне энергетыкі , стваральнік навуковай школы па энергетычных навукова-вымяральных сістэмах, заслужаны вынаходнік Беларусі — **95 г.**

**5** — **Дзяржаўны мемарыяльны комплекс “Хатынь”** (Лагойскі раён, 1969 г.) — **55 гадоў з часу заснавання**

6 — “**Курган Славы Савецкай Арміі-вызваліцельніцы Беларусі”**, мемарыяльны комплекс у памяць воінаў 1, 2, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў у Беларускай аперацыі 1944 г., філіял Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу “Хатынь”, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь (Смалявіцкі раён, 1969 г.) — **55 гадоў з часу адкрыцця.**

**5** — **Булгарын Фадзей (Тадэвуш) Венедыктавіч** (1789, в. Пырашава, Уздзенскі раён — 1859), расійскі журналіст, пісьменнік, літаратурны крытык — **235 г.**

**7** — **Курто Яўген Іванавіч** (1924, былая в. Рачыборак, Бярэзінскі раён — 1993), пісьменнік, аўтар кніг для дзяцей і юнацтва, удзельнік падпольнага руху ў Вялікую Айчынную вайну — **100 г.**

**12** — **Лабко Пётр Іосіфавіч** (1929, Клецкі раён — 2011), вучоны ў галіне анатоміі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, член Беларускай Акадэміі экалагічнай антрапалогіі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **95 г.**

**15** — **Макарэвіч Васіль Сцяпанавіч** (1939, в. Купленка, Крупскі раён — 2017), паэт, журналіст, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова — **85 г.**

**15** — **Навасад Пётр Аляксадравіч** (1939, в. Шэлехава, Пухавіцкі раён — 2007), спявак (барытанальны тэнар), заслужаны артыст Беларусі — **85 г.**

**21** — **Каваленка Віктар Антонавіч** (1929, в. Сакаўшчына, Валожынскі раён — 2001), крытык, літаратуразнаўца, празаік, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Коласа — **95 г.**

**21** — **Кандрацьеў Іван Казіміравіч** (1849, в. Каловічы, Вілейскі пав., Вілен. губ. (цяпер Вілейскі раён) — 1904), беларускі і расійскі пісьменнік, перакладчык, гісторык — **175 г.**

**21** — **Мінько Леанід Якаўлевіч** (1934, Старадарожскі раён — 2002), вучоны-фізік, адзін са стваральнікаў беларускай навуковай школы лазернай плазмадынамікі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974, 1992) — **90 г.**

**22** — **Барысёнак Барыс Васільевіч** (1934, г. Беразіно), акцёр, заслужаны артыст Беларусі — 90 г.

**24** — **Нядзведскі Уладзіслаў Іосіфавіч** (1929, в. Рахавічы, Салігорскі раён — 1973), пісьменнік — **95 г.**

**25** — **Аколава Валянціна Валянцінаўна** (1954, в. Мазуршчына, Салігорскі раён — 2013), паэтка, асобныя вершы якой пакладзены на музыку, перакладчыца — **70 г.**

**25** — **Жук Валерый Іванавіч** (1949, в. Паўстынь, Слуцкі раён), мастацтвазнавец, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1996) — **75 г.**

**27** — Філіял Літаратурнага музея Максіма Багдановіча **"Фальварак Ракуцёўшчына"** (в. Ракуцёўшчына, Маладзечанскі раён, 1994 г.) — **30 г. з часу адкрыцця**

**31** — **"Мінскі абласны краязнаўчы музей"**, дзяржаўная ўстанова (г. Маладзечна, 1959) — **65 гадоў з часу заснавання** (адкрыты 26.04.1964)

Жнівень

**4** — **Радзівіл Аляксандр Людвік** (1594, г. Нясвіж — 1654), дзяржаўны і ваенны дзеяч Вялікага Княства

Літоўскага, удзельнік вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1632—1634 гг. — **430 г.**

**10** — **Луцэвіч Андрэй Піліпавіч** (1919, Пухавіцкі раён — 1944), удзельнік баёў у Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944) — **105 г.**

**13** — **Захараў Іван Кузьміч** (1909, Лагойскі раён — 1982), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, заслужаны работнік культуры Беларусі — **115 г.**

**15** — **Давідовіч Мікалай Пятровіч** (1919, Лагойскі раён — 1993), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага сюза — **105 г.**

**15** — **Бялько Іван Васільевіч** (1944, в. Бярозаўка, Салігорскі раён), вучоны-матэматык, педагог, выдатнік народнай асветы, аўтар навучальных дапаможнікаў для ВНУ — **80 г.**

**20** — **Парахневіч Міхась (Міхаіл Прохаравіч)** (1934, в. Мінкавічы, Старадарожскі раён — 2001), паэт, празаік, публіцыст, аўтар твораў для дзяцей і юнацтва — **90 г.**

**20** — **Гамза Мікалай Аляксандравіч** (1939, в. Траянава, Капыльскі раён), вучоны ў галіне спартыўнай медыцыны, заслужаны трэнер Беларусі, выдатнік адукацыі Беларусі — **85 г.**

**29** — **Санько Валеры** (1939, в. Вялікая Сліва, Слуцкі раён), пісьменнік, журналіст, краязнаўца, кнігавыдавец — **85 г.**

**30** — **Ходзька (Барэйка) Аляксандр** (1804, мяст. Крывічы, Вілейскі пав., Мін. губ. (цяпер г. п. Крывічы, Мядзельскі раён) — 1891), паэт, фальклярыст, славіст, усходазнаўца — **215 г.**

Верасень

**1** — **"Музей гісторыі Клеччыны"**, дзяржаўная ўстанова (1979) — **45 гадоў з часу адкрыцця**

**1** — **Салавей Лія Мацвееўна** (1934, Мядзельскі раён), фалькларыстка, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986) — **90 г.**

**2** — **Шапялевіч Канстанцін Іванавіч** (1889, в. Брадок, Мін. пав., Мін. губ. (цяпер Мінскі раён) — 1976), мовазнаўца, краязнаўца, педагог, аўтар і суаўтар літаратурных чытанак і падручнікаў па беларускай мове для пачатковай школы — **135 г.**

**6** — **Белахвосцік Валянцін Сяргеевіч** (1934, в. Багушэвічы, Бярэзінскі раён — 2003), акцёр, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **90 г.**

**8** — **Плешавеня Аляксандр Мікітавіч** (1924, Любанскі раён — 1993), вучоны-гісторык, архівіст, заслужаны работнік культуры Беларусі — **100 г.**

**11** — **Пратасевіч Іван Іовіч** (1889, в. Клешава, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер Слуцкі раён) — 1969), педагог, метадыст, аўтар падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па беларускай мове і літаратуры для агульнаадукацыйных школ у 1920—1930-я гг. — **135 г.**

**12** — **Алейнік Уладзімір Пятровіч** (1959, г. Смалявічы), спартсмен (скачкі ў ваду з вышкі), трэнер, майстар спорту СССР міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту СССР, бронзавы прызёр XXI Алімпійскіх гульняў (1976, Манрэаль), сярэбраны прызёр XXII Алімпійскіх гульняў (1980, Масква), чэмпіён Еўропы (1977) і СССР (1976, 1980) — **65 г.**

**13** — **Лабанок Алесь Іванавіч** (1944, г. Мар'іна Горка, Пухавіцкі раён — 2005), артыст Віцебскага тэатра імя Я. Коласа — **80 г.**

**14** — **Нясвіжскі касцёл Божага Цела** (Фарны касцёл). Першы помнік архітэктуры барока на тэрыторыях Беларусі і Польшчы, які разам з Нясвіжскім палацава-паркавым ансамблем уключаны ў спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, занесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь (пабудаваны ў 1589—1593 гг.) — **435 г. з пачатку будаўніцтва**

**17** — **“Агатка, ці Прыезд пана”** (1748, г. Нясвіж), камічная опера Я. Д. Голанда, першы вядомы арыгінальны музычна-сцэнічны твор, створаны і пастаўлены на Беларусі — **240 г.**

**19** — **Галубовіч Генадзь Міхайлавіч** (1934, в. Вялешына-1, Капыльскі раён — 1992), графік, заслужаны работнік культуры Беларусі, выдатнік друку Беларусі — **90 г.**

**23** — **Вольскі (сапр. Вольскі-Зэйдэль) Артур Вітальевіч** (1924, г. Койданава (цяпер г. Дзяржынск) — 2002), паэт, празаік, драматург, перакладчык, аўтар твораў для дзяцей — **100 г.**

**26** — **Шпартаў Уладзімір Нічыпаравіч** (1939, г. Лагойск), жывапісец, які працуе ў жанрах тэматычна-сюжэтнай карціны, партрэта, пейзажа — **85 г.**

**26** — **Дубовік Барыс Валянцінавіч** (1939, г. Заслаўе, Мінскі раён), вучоны ў галіне фармакалогіі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1991) — **85 г.**

**26** — **Яскевіч Ядвіга Станіславаўна** (1949, г. Барысаў), вучоны-філосаф, педагог, выдатнік адукацыі — **75 г.**

**27** — **Калюга Лукаш (сапр. Вашына Канстанцін Пятровіч)** (1909, в. Скварцы, Дзяржынскі раён — 1937), пісьменнік, перакладчык — **115 г.**

**27** — **Рапановіч Яўген Нічыпаравіч** (1929, Мядзельскі раён — 1987), мовазнавец, фальклярыст, аўтар грунтоўнай лексікаграфічнай працы — слоўнікаў назвы населеных пунктаў Беларусі па абласцях — **95 г.**

## Кастрычнік

**“Дудуткі”**, музейны комплекс старажытных народных рамёстваў і тэхналогій, гандлёва-вытворчае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства (Пухавіцкі раён, 1994) — **30 г.**

**2** — **Казакевіч Павел Канстанцінавіч** (1904, в. Забашавічы, Барыс. пав., Мін. губ. (цяпер Барысаўскі раён) — 1934), ваенны дзеяч, удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг., Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза —**120 г.**

**6 — “Лесахімік”**, адкрытае акцыянернае таварыства, старэйшае прадпрыемства Рэспублікі Беларусь у галіне лесахіміі (г. Барысаў, 1929) — **95 г.**

**8 — Жаўрыд Эдвард Антонавіч** (1939, г. Слуцк — 2021), вучоны ў галіне анкалогіі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988) — **85 г.**

**10 — Казей Марат Іванавіч** (1929, Дзяржынскі раён — 1944), піянер-партызан у Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1965) — **95 г.**

**14 — Бабарэка Адам Антонавіч** (1899, в. Слабада-Кучынка, Капыльскі раён — 1938), пісьменнік, крытык, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў літаратунага аб'яднання “Маладняк” і “Узвышша” — **125 г.**

**15 — Доўнар Таісія Іванаўна** (1944, в. Шацк, Пухавіцкі раён), вучоны-юрыст, педагог, выдатнік адукацыі Беларусі — **80 г.**

**15 — Мурашка Анцінея Рыгораўна** (1924, Слуцкі раён — 2011), мовазнавец, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1971) — **100 г.**

**15 — Случанін Лявон (сапр. Шпакоўскі Лявон (Лявонцій) Раманавіч)** (1914, в. Лучнікі, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер Слуцкі раён) — 1995), паэт, аўтар гістарычнай паэмы “Рагнеда”, аўтабіяграфічнага рамана ў вершах “Алесь Няміра” — **110 г.**

**18 — Наруцкі Дзяніс (Дзіянісій) Сільвестравіч** (1904, мяст. Пагост, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер в. Пагост, Салігорскі раён) — 1960), удзельнік савецка-фінлядскай вайны 1939—1940 гг., Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **120 г.**

**24 — Смолік Аляксандр Іванавіч** (1944, в. Каловічы, Вілейскі раён), вучоны-культуролаг і гісторык, педагог, стваральнік айчыннай культуралагічнай школы, аўтар манаграфій і падручнікаў па тэорыі, гісторыі і прыкладной культуралогіі, прац па гісторыі Беларусі — **80 г.**

**24 — Жук Мікола (Мікалай Андрэевіч)** (1914, в. Паўстынь, Слуцкі раён — 1995), паэт, педагог, выдатнік

народнай асветы Беларусі, удзельнік партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну — **110 г.**

**25 — Сапега Ян Станіслаў** (1589, мяст. Маладзечна, Мін. пав., Мін. ваяводства — 1635), дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага — **435 г.**

**31 — Кокштыс Тадэвуш Антонавіч** (1934, в. Хоўхлава, Маладзечанскі раён), акцёр, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, тэатральнай прэміі І. Буйніцкага, кавалер ордэна Францыска Скарыны — **90 г.**

## Лістапад

**1 — Гуляка Леанід Паўлавіч** (1949, Клецкі раён), дзяржаўны дзеяч Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Беларусі — **75 г.**

**2 — Раловец Вікенцій Антонавіч** (1894, в. Забрэззе, Валожынскі раён — 1984), удзельнік Першай сусветнай вайны, кавалер чатырох Георгіеўскіх крыжоў — **130 г.**

**2 — Лужанін Максім (сапр. Каратай Аляксандр Амвросьевіч)** (1909, в. Прусы, Слуц. пав., Мін. губ. (цяпер Салігорскі раён) — 2001), пісьменнік, кінадраматург, перакладчык, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Польшчы, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Я. Коласа (1965) — **115 г.**

**7 — Рыбак Алесь (Аляксандр Пятровіч)** (1934, былая в. Макаўчыцы, Дзяржынскі раён), пісьменнік — **90 г.**

**10 — Радзівіл Мацей** (1749, г. Нясвіж — 1800), дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, драматург, кампазітар — **275 г.**

**16 — Семяжон Язэп (сапр. Семяжонаў Іосіф Ігнатавіч)** (1914, в. Пятровічы, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер Смалявіцкі раён) — 1990), перакладчык, пісьменнік, крытык, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы — **110 г.**

**17 — Гільман Залман Давыдавіч** (1929, г. Барысаў), вучоны ў галіне селекцыі і развядзення сельскагаспадарчых жывёл, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі — **95 г.**

**20 — Аляксандр (у свеце Шалай Аляксандр Сямёнавіч)** (1879, г. Слуцк — 1937), протаіерэй, новапакутнік Мінскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы — **145 г.**

**20 — Клімковіч Міхась (Міхаіл Мікалаевіч)** (1899, в. Сялітранка, Барысаўскі раён — 1954), пісьменнік, крытык, драматург — **125 г.**

**22 — Малашка Віктар Віктаравіч** (1949, в. Жырмоны, Уздзенскі раён), вучоны ў галіне ветэрынарыі, аўтар шматлікіх манаграфій і навучальных дапаможнікаў, выдатнік адукацыі Беларусі — **75 г.**

**24 — Ганчарык Міхаіл Мікалаевіч** (1899, аг. Кляннік, Смалявіцкі раён — 1986), вучоны ў галіне фізіялогіі раслін, член-карэспандэнт НАН Беларусі, дзеяч навукі Беларусі — **125 г.**

**25 — Міцкевіч Уладзімір Аляксандравіч** (1919, Стаўбцоўскі раён — 2004), літаратуразнавец, крытык — **105 г.**

**27 — Басалыга Дзмітрый Мікалаевіч** (1884, в. Варкавічы, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер Слуцкі раён) — 1969), рэвалюцыянер, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. і грамадзянскай вайны, дзеяч тэатра і кінамастацтва — **140 г.**

**28 — Сарока Рыгор Сямёнавіч** (1944, в. Турэц-Баяры, Маладзечанскі раён), дырыжор, педагог, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2004), прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2017), кавалер ордэна Ф. Скарыны (2008) — **80 г.**

**29 — Міцкевіч Мікалай Іванавіч** (1914, г. Дзяржынск — 1991), вучоны ў галіне фізіка-хіміі, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — 110 г.

## Снежань

**Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па жывёлагадоўлі** (г. Жодзіна, 1949) — **75 г.**

**4 — Альпяровіч Леў Абрамавіч** (1874, мяст. Куранец. Віл. пав., Вілен. губ. (цяпер аг. Куранец, Вілейскі

раён) — 1914), жывапісец, рысавальшчык, аўтар партрэтаў, пейзажаў, бытавых кампазіцый — **150 г.**

**5 — Няхай Рыгор Восіпавіч** (1914, в. Сяліба, Ігумен. пав., Мін. губ. (цяпер Бярэзінскі раён) — 1991), пісьменнік, перакладчык, педагог — **110 г.**

**10 — Белы Анатоль Яўхімавіч (Яфімавіч)** (1939, г. Старыя Дарогі — 2011), грамадскі і культурны дзеяч, мастацтвазнаўца, калекцыянер, заснавальнік і былы старшыня грамадска-асветніцкага клуба "Спадчына" — **85 г.**

**10 — "Старадарожскі музей выяўленчага мастацтва"**, прыватная ўстанова культуры (1999) — **25 гадоў з часу адкрыцця**

**16 — Шаўцоў Юрый Анатольевіч** (1959, г. Слуцк), спартсмен і трэнер (гандбол), заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіён XXIV летніх Алімпійскіх гульняў (1988, Сеул), чэмпіён свету (1982), шасцікратны чэмпіён СССР, кавалер ордэна "Знак Пашаны" — **65 г.**

**24 — Далега-Хадакоўскі Зарыян Якаўлевіч (сапр. Чарноцкі Адам)** (1784, маёнтак Падгайна каля в. Гайна, Мін. пав., Мін. ваяв. (цяпер Лагойскі раён) — 1825) — славяназнаўца, адзін з пачынальнікаў беларускай, рускай, польскай і ўкраінскай археалогіі, старажытнай гісторыі, фальклярыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі — **240 г.**

**25 — Чарняк Сцяпан Іванавіч** (1899, в. Чарневічы, Барысаўскі раён — 1976), военачальнік, удзельнік грамадзянскай вайны, вайны ў Іспаніі 1936—1939 гг., савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг., вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, генерал-маёр, Герой Савецкага Саюза (1940) — **125 г.**

**25 — Сіліванові Нікадзім Юр'евіч** (1834, в. Цынцавічы, Віл. пав., Вілен. губ. (цяпер Вілейскі раён) — 1919), беларускі і расійскі жывапісец, педагог, акадэмік Пецярбургскай АМ — **190 г.**

**25 — Лагоўская Алена Іванаўна** (1904, г. Чэрвень — 1981), актрыса, заслужаная артыстка Беларусі — **120 г.**

**25** – **Сцяшковіч Таццяна Пиліпаўна** (1904, г. Чэрвень – 1986), мовазнавец, педагог, залужаны настаўнік Беларусі – **120 г.**

**26** – **Бярковіч Марыя Веньямінаўна** (1909, г. Беразіно – 1993), мастак кіно, жывапісец, графік – **115 г.**

**26** – **"Гарадзейскі цукровы камбінат"**, адкрытае акцыянернае таварыства (Нясвіжскі раён, 1959) – **65 г.**

**27** – **Макарава Галіна Кліменцьеўна** (1919, г. п. Старобін, Салігорскі раён – 1993), актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Беларусі і СССР, узнагароджана ордэнам Леніна – **105 г.**

**30** – **Аксельрод Зэлік Майсеевіч** (1904, мяст. Маладзечна, Віл. пав., Вілен. губ. (цяпер г. Маладзечна) – 1941), яўрэйскі паэт, публіцыст – **120 г.**

**31** – **Варвашэня Іван Дзянісавіч** (1904, в. Быстрыца, Слуцкі пав., Мін. губ. (цяпер Капыльскі раён) – 1957), партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін з кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну – **120 г.**